Пралетарыі ўсіх краін, еднайц

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцк
Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 29 (241) | Аўторак, 20 снежня 1955 года. | Цана 20 кап.

## ДЗЕНЬ ЖЫЦЦЯ

Вам знаёма тое пачуццё нецярплівасці, радаснага чакання, прыўзнятасці, якое адчуваеш у зале тэатра перад заслонай, вось-вось гатовай раскрыцца? Ці не з такім пачуццём сустракаеш часам новы дзень? Толькі ўжо не як назіральнік, а як удзельнік, гаспадар падзей.

Ці прамень сонца злавіў ваш першы позірк раніцой, ці дождж барабаніць у шыбы, ці размаляваў іх мароз—усероўна ён цудоўны, гэты новы дзень. Ён падганяе, кліча: хутчэй за справу.

Чые сэрцы не выпешчвалі ў юнацтве смелыя, неўтаймоўныя парывы, мары: хачу даследваць новыя землі, узводзіць гарады, вынаходзіць, адкрываць, будаваць... Але мара здзяйсняецца толькі ў настойлівай працы, не пасля, не калі-небудзь, а сёння, цяпер, вось у такі-ж будзённы дзень, просты дзень нашага жыцця.

«Дзень, вялікі»,—кажуць адны. «Як час ляціць»,—бядуюць другія. Ён доўгі і мімалётны, дзень жыцця. І хочацца пражыць яго так, каб хвіліны не цяклі бясколерным струменем, каб ён пакінуў у жыцці добры след. Але не заўсёды бывае так.

«У мяне ёсць сусед, інжынер Аляксандр Н.,—піша І. Цімафееў з Вільнюса.—Ён прыходзіць дадому, валіцца ў рабочым касцюме і чаравіках на ложак і курыць, курыць. «Адпачыўшы» такім чынам, Саша ідзе гуляць. Вяртаецца ён звычайна глыбокай ноччу, добра выпіўшы. Саша амаль не чытае. Улюбёныя яго заняткі—прэферанс «пад выпіўку». Так праходзяць яго дні...»

Ці не пра іх, тых, хто неразумна, бязмэтна растрачвае дні, сказаў са сваёй сумнай усмешкай Чэхаў: «Крыўдна і горка... што жыццё, якое даецца чалавеку толькі адзін раз, праходзіць без карысці...» Ці не пра іх гнеўныя некрасаўскія радкі: «Суждены вам благие порывы, но свершить ничего не дано».

Той, хто многа зрабіў у жыцці, чыя думка і праца ўвасобіліся ў вялікіх справах чалавека, добра ведае, што такое барацьба за час, кожная яго гадзіна, кожная хвіліна. Самыя лепшыя намеры могуць знікнуць, як дым, калі не навучышся працаваць сістэматычна, з дня ў дзень—за школьнай партай, студэнцкім сталом, у лабараторыі завода, над кнігай. Колькі разоў мы гаворым сабе: паспеецца; зраблю заўтра, потым. А час, як марскі прыліў, прыб'е да берагу вашага жыцця новыя і новыя думкі, абавязкі, клопаты. І добрае, важнае адсунулася, забылася. «Ніколі не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць сёння»,—вучыць добрая прыказка.

Дзень нельга вырваць са складанага ланцуга часу. Ён адрэзак вялікай і цяжкой дарогі. Уменне глядзець у будучыню, будаваць яе па глыбока прадуманых прадвызначэннях—асаблівасць нашага жыцця. Яна ўвасобілася ў нашых слаўных пяцігодках, у нашых смелых планах. Але вялікае складаецца з малога. У кожнага чалавека павінен быць свой разумны, празорлівы план. Толькі тады намаганні дня сальюцца з іншымі, лягуць новай цаглінай ва ўзводзімы будынак, павядуць увысь. Вы рашылі вывучаць Леніна, гісторыю мастацтваў, мову, задумалі вялікую працу—падзяліце свой план на месяцы, тыдні, дні. Чоткі, дзейсны план дапаможа вам прайсці па жыццю далей, прамей.

«Мне сумна думаць пра сваю дачку,—піша ў рэдакцыю Екацярына Паўлаўна Р.—Яна вучыцца ў Маскве трэці год. Але я ўсё менш пазнаю маю былую жвавую дачку ў гэтай панурай, флегматычнай дзяўчыне, калі яна прыязджае на канікулы. Мая Аля вельмі мала атрымлівае ад культурных багаццяў Масквы, замкнулася ў цесным кутку сваёй інстытуцкай групы. Калі я была студэнткай, комсамолкай, маё жыццё было зусім інакшым. Я вяла гурткі на кабельным заводзе, і сувязь з рабочай моладдзю давала мне так многа. Я збірала гісторыю першых комсамольцаў, капалася ў архівах Пуцілаўскага і Абухаўскага заводаў. Я слухала выступленні Маякоўскага, Уткіна, Безыменскага... Чаму-ж мая дачка жыве бясколерным, нецікавым жыццём?»

Жывым папрокам комсамольцам ВНУ гучаць словы маці. Чалавек не можа замкнуцца ў сваім кабінеце, лабараторыі, засланіцца ад свету сваёй прафесіяй, перастаць заўважаць людзей, думаць аб іх. Для каго-ж ён працуе, такі служака або кар'ерыст? Што ён зрабіў для іншых, каго сагрэў увагай, пачуў, зразумеў? Што сам убачыў у жыцці? Як папяровыя старонкі шастаюць, праносяцца яго дні. А час перацірае ніці сяброўства, прыхільнасці, прытупляе пачуцці, сушыць сэрца. Не, гэта чалавек не нашага часу. Новы, наш чалавек—той, чыё сэрца адкрыта для людзей, хто бачыць жыццё ва ўсёй яго паўнаце, у каго гарыць вялікая ідэя служэння людзям, барацьбы за новае жыццё.

Кожны дзень—вялікае багацце, кожны—часцінка жыцця. Але днём можна даражыць па-рознаму. Адзін прачынаецца з думкай: што я зраблю сёння для роднай краіны; другі—што я вырву для сябе. Нам чуждая псіхалогія тых, хто гаворыць сабе: «Жыві сёння, а ўчора і заўтра не так патрэбны ў зямным календары», псіхалогія марнатраўцаў жыцця, ахвотнікаў пырхаць па зямлі, зрываючы толькі кветкі забаў. Нікчэмнікам, трутням не месца ў нашай сям'і, сям'і працаўнікоў.

Новы дзень пачаўся за акном—дзень стваральнай працы, барацьбы, здзяйсненняў дзеля людзей. Няхай у ім будзе месца і любімай працы, і музыцы, і кнізе, і вясёлай сустрэчы з сябрамі. Мы за паўнату жыцця, за тое, каб яно ззяла ўсімі фарбамі. Мы супраць рабскага, абыякавага светаадчування: «День да ночь—сутки прочь». Няхай кожны з нас можа сказаць вечарам, як гаварыў Нікалай Астроўскі: «Пражыты яшчэ адзін дзень жыцця, самы звычайны, пражыты добра...»

(«Комсомольская правда» № 272.)

## 50 ГОД ПЕРШАЙ РУСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Зараз совецкі народ і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаюць 50 год першай рускай рэволюцыі.

Кабінетам палітычнай эканоміі універсітэта арганізавана стэнд-выстаўка, прысвечаная гэтай гістарычнай даце. На стэндзе экспануюцца зборнік прац В. І. Леніна «Аб рэволюцыі 1905—1907 гг.», працы І. В. Сталіна—«Коратка аб партыйных рознагалоссях», «Часовы рэволюцыйны ўрад і соцыял-дэмакратыя», «Аграрнае пытанне», «Анархізм ці соцыялізм» і інш. Акрамя таго, на выстаўцы ёсць спісы рэкамендацыйнай літаратуры, прысвечанай першай рускай рэволюцыі 1905—1907 гг., аглядны артыкул акадэміка А. Панкратавай—«Міжнароднае значэнне першай рускай рэволюцыі», шэраг газетных і часопісных артыкулаў, прысвечаных рэволюцыйнаму руху рабочых і сялян Беларусі ў 1905—1907 гг. На стэндах можна бачыць фотаздымкі старых большэвікоў Беларусі.

Асабліва цікавы артыкул—«Удзел сялян Мінскай губерні ў рэволюцыі 1905—1907 гг.», апублікаваны старшым навуковым супрацоўнікам Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва СССР у г. Ленінградзе тав. Э. Паінай.

Стэнд дапаможа студэнтам універсітэта глыбей вывучыць гісторыю рускай рэволюцыі.

**Н. ЯРАВІКОЎ,**
**заг. кабінетам палітэканоміі.**

## *ЦІКАВЫ ВЕЧАР*

**17 снежня ва універсітэцкім клубе адбыўся вечар, прысвечаны месячніку французска-совецкай дружбы.**

**Вечар адкрыў уступным словам загадчык кафедры зарубежнай літаратуры дацэнт Д. Е. Фактаровіч. З мастацкім чытаннем класічных і сучасных твораў французскай літаратуры выступілі студэнты Васілевіч, Гарошка і Гурэвіч. Гучаць вершы Гюго і Элюара, палымяныя словы прамовы на судзе Жульена Сарэля з рамана «Чырвонае і чорнае».**

**Аспірант кафедры зарубежнай літаратуры Б. Міцкевіч расказаў аб перакладах і выданнях твораў французскіх пісьменнікаў у нашай рэспубліцы.**

**У заключэнне быў паказан кінофільм «Парыж».**

**Б. ВАРЫВОНЧЫК.**

## СХОД ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

10 снежня ў клубе універсітэта адбыўся сход фізкультурнага актыву.

З дакладам аб поспехах калектыву фізкультурнікаў універсітэта і задачах спартсменаў на будучы год выступіў загадчык кафедры фізвыхавання т. Маркаў.

Затым былі ўручаны ўзнагароды—граматы і дыпломы лепшым спартсменам універсітэта за перамогі ў рэспубліканскіх спаборніцтвах і першынствах.

Для ўдзельнікаў сходу былі паказаны спартыўныя кіначасопісы: «Першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы», «Турысты на лыжах», «Спаборніцтвы на першынство Еўропы па каньках сярод жанчын».

## Слова да студэнтаў

*Дарагія таварышы!*

*Я з вялікай прыемнасцю прыняў запрашэнне — прачытаць вам аклад па маёй навуковай спецыяльнасці, бо я вельмі люблю совецкую студэнцкую моладзь і заўсёды стараюся мець з ёй самы цесны зелавы кантакт.*

*На вялікі жаль, з-заператомленасці, я адчуў сябе дрэнна— выніку ўрач катэгарычна забараніў мне выступаць з дакладам.*

*Я вымушан падпарадкавацца патрабаванню ўрача. Прашу вас— рабачце мне, што не магу выканаць маё абяцанне.*

*Адначасова хачу выказаць вам сардэчнае прывітанне і самыя эрачыя, шчырыя пажаданні быць здаровымі, шчаслівымі, не траіць ніколі бадзёрасці.*

*Будзьце сумленнымі, прынцыповымі грамадзянамі нашай вялікай Радзімы, любіце яе, працуйце на яе карысць. Засвойвайце за школьнай, студэнцкай партай выкладаемыя вашымі настаўнікамі веды, бо кожная дэталь любой навукі можа вам спатрэбіцца ў вашай далейшай дзейнасці. Любіце навуку, літаратуру, мастацтва, успрыймайце ўсё яркае, прыгожае, добрае, — усё тое, што пашырае ваш разумовы светапогляд, што дапамагае вам працаваць, упрыгожвае і адухаўляе ваша жыццё, вашу дзейнасць. Будзьце аптымістамі, энтузіястамі працы, бо ў нашай цудоўнай краіне не можа быць іншага настрою, паколькі кожны совецкі чалавек актыўна ўдзельнічае ў вялікім будаўніцтве нашай выдатнай Радзімы, а будаваць, ствараць — гэта найвялікшае шчасце!*

*Такія мае вам пажаданні. Прыміце ад мяне сардэчнае прывітанне.*

**Акадэмік К. І. СКРАБІН.**

## *СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ*

14 снежня калектыў навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта адзначыў слаўны юбілей члена - карэспандэнта Акадэміі навук БССР, загадчыка кафедрай сістэматыкі раслін, доктара сельскагаспадарчых навук Нікалая Афанасьевіча



Дарожкіна — пяцідзесяцігоддзе з дня нараджэння і трыццаціgоддзе навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

Павіншаваць юбіляра прышлі навуковыя супрацоўнікі, аспіранты, студэнты. Зяленіна й і кветкамі была ўпрыгожана аудыторыя, у якой адбывалася юбілейнае пасяджэнне.

Навуковы супрацоўнік О. Д. Акімава расказала аб жыццёвым шляху юбіляра — ад сына селяніна-бедняка да буйнага вучонага-фітапатолага.

Нарадзіўся Нікалай Афанасьевіч у 1905 годзе. Вышаўшы з асяроддзя беднага сялянства, ён мог атрымаць вышэйшую адукацыю толькі пры совецкай уладзе, якая адкрыла народу ўсе шляхі да навукі. У 1927 годзе Н. А. Дарожкін закончвае Сельскагаспадарчую акадэмію і ў тым-жа годзе становіцца членам Комуністычнай партыі.

Некаторы час ён працуе асістэнтам пры кафедры фітапаталогіі акадэміі, а потым прызначаецца дырэктарам Барысаўскага тэхнікума.

З 1931 г. Н. А. Дарожкін працуе ў Акадэміі навук БССР вучоным-спецыялістам, арганізоўвае лабараторыю, якой кіруе на працягу 25 год.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце Н. А. Дарожкін вядзе навукова-педагагічную дзейнасць з 1934 года. З 1948 г. ён чытае курс раслінаводства, з'яўляючыся адначасова загадчыкам кафедры сістэматыкі раслін.

У 1950 годзе Нікалая Афанасьевіча выбіраюць членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.

За сваю трыццацігадовую навуковую дзейнасць Н. А. Дарожкін зрабіў вялікі ўклад у развіццё навукі аб хваробах раслін — фітапаталогіі. Ім апублікавана каля 100 работ па пытаннях вывучэння грыбных захворванняў раслін і метадах барацьбы з гэтымі захворваннямі.

З прывітаннямі ў адрас юбіляра выступілі навуковыя работнікі, прафесары, дацэнты т. т. І. С. Лупіновіч, Г. А. Павецьеў, Т. Н. Годнеў, Д. А. Забела, І. Г. Ленкевіч, Н. В. Турбін, С. Г. Скрыганаў, В. К. Гаравец, М. Е. Баранава. Ад калектыву студэнтаў біёлага-глебавага факультэта юбіляра шчыра павіншавала студэнтка Чарняўская.

Пасля гэтага былі зачытаны віншавальныя тэлеграмы і пісьмы ад Міністэрства вышэйшай адукацыі, ад акадэміка Т. Д. Лысенкі, ад прэзідэнта АН БССР В. Ф. Купрэвіча, ад многіх народнагаспадарчых устаноў краіны.

У заключэнне выступіў цепла сустрэты прысутнымі Н. А. Дарожкін. Ён горача падзякаваў прысутных за аказаную яму ўвагу, выразіў удзячнасць дарагой Комуністычнай партыі і заверыў, што і надалей не будзе шкадаваць сіл і энергіі на развіццё і прагрэс айчыннай навукі.



*Днямі ў пакоі адпачынку інтэрната корпуса «А» адбылася сустрэча з паэтам Максімам Лужаніным.*

*Ён расказаў аб сваім падарожжы ў Чэхаславакію, падзяліўся ўспамінамі пра П. Труса і К. Чорнага, адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.*

*НА ЗДЫМКУ: студэнты аддзялення беларускай мовы і літаратуры з паэтам М. Лижаніным.*

Фото Л. БОНДАРА і Ф. ПАЗНЯКЕВІЧА.

